# Пераемнасць: сатворчасць у дасягненні адзінай мэты



**Мікалай Антонавіч АПІМАХ,**
**дэкан факультэта дашкольнага выхавання, дацэнт, кандыдат гістарычных навук**



**Таццяна Васільеўна ПАЗДЗЕЕВА,**
**намеснік дэкана факультэта дашкольнага выхавання, дацэнт, кандыдат педагагічных навук**

Неабходнай умовай арганізацыі паўнавартаснага працэсу навучання і выхавання выступае забеспячэнне пераемнасці на ўсіх ступенях сістэмы адукацыі. Прычым маецца на ўвазе не толькі паступовае раўнамернае разумовае развіццё, але і скачкападобныя змены на працягу яго, звязаныя з пераадольваннем супярэчнасцей свядомасці, пад час якіх, аднак, захоўваецца і пастаянна ўдасканальваецца ўстаноўка асобы на набыццё ведаў, на пашырэнне інтэлектуальнага кругагляду. Сёння ўсё больш глыбока ўсведамляецца неабходнасць вывучэння праблемы пераемнасці на стыку двух непарыўна звязаных звёнаў сістэмы адукацыі: дзіцячага сада і пачатковай школы. На практыцы гэтую ўзаемасувязь закліканы ажыццяўляць як настаўнікі-пачаткоўцы, так і выхавальнікі дашкольных устаноў.

Сучасная сітуацыя ў сістэме дашкольнага выхавання характарызуецца разнастайнасцю мадэлей дашкольных устаноў і праграм, больш уважлівымі адносінамі да патрэб сям'і, гуманізацыяй выхавання і г. д. Таму набыла асаблівую актуальнасць ідэя стварэння дадатковых спецыяльнасцей і спецыялізацый на факультэтах дашкольнага выхавання. Яе рэалізацыя дазваляе падрыхтаваць для дзіцячых садоў спецыялістаў, здольных забяспечыць як асноўныя, так і дадатковыя педагагічныя паслугі для дзяцей.

На сучасным этапе значна ўдасканалены вучэбныя планы ўсіх спецыялізацый. Выпускнікі нашага факультэта яскрава ўсведамляюць, чаго чакае школа ад дашкольных устаноў. Выхавальнікам і настаўнікам неабходна ўлічваць псіхалагічныя асаблівасці развіцця дзяцей, разумець складанасць і адказнасць моманту пераходу ад дашкольнага да школьнага дзяцінства, асцярожна фарміраваць у вучняў навыкі вучэбнай дзейнасці, жаданне і ўменне вучыцца.

Для ўдасканалення падрыхтоўкі студэнтаў да работы з першакласнікамі педагагічная практыка "Першыя дні дзіцяці ў школе" ўведзена ў вучэбны працэс на выпускным курсе. Пад час яе будучыя педагогі вызначаюць ступень сваёй падрыхтаванасці да творчай работы ў якасці выхавальніка.

Факультэт перайшоў на шматузроўневую сістэму навучання. Гэта дазваляе студэнтам выбіраць узровень адукацыі: бакалаўрыят або магістратуру.

На факультэце функцыяніруюць тры кафедры: агульнай і дашкольнай педагогікі, агульнай і дзіцячай псіхалогіі, методык дашкольнага выхавання. Тут працуюць 26 дацэнтаў, 4 прафесары (сярод іх 3 дактары навук) — усяго 50 штатных выкладчыкаў дзеляцца са студэнтамі сваімі ведамі і вопытам.

**Кафедру агульнай і дашкольнай педагогікі,** створаную ў 1966 годзе на педагагічным факультэце, напачатку ўзначальвала дацэнт (пазней — прафесар) Г. Г. Петрачэнка. Пад яе кіраўніцтвам ствараліся праграмы педагагічных практык, планы семінарскіх і практычных заняткаў па дашкольнай педагогіцы, па методыках дашкольнага выхавання. У гэты час тут плённа працавалі А. П. Брыт, Н. С. Драгун, Я. І. Кавальчук — яе кніга "Індывідуальны падыход у выхаванні і навучанні дзяцей дашкольнага ўзросту" неаднаразова перавыдавалася не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі; А. І. Васільева — яе вучэбна-метадычныя дапаможнікі да гэтага часу карыстаюцца папулярнасцю ў педагогаў дашкольных устаноў. Нязменна карыстаюцца поспехам у практыкаў метадычныя дапаможнікі І. І. Кабіцінай. Пазней калектыў папоўніўся новымі кадрамі, якія ўнеслі новы важкі ўклад у развіццё сістэмы дашкольнага выхавання рэспублікі. Выкладчыкі кафедры шмат увагі ўдзяляюць вучэбнай, вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай і грамадскай рабоце. Актыўна дзейнічае пад іх кіраўніцтвам студэнцкае навуковае таварыства.

У розныя перыяды кафедру ўзначальвалі А. І. Васільева, З. В. Арцёменка — зараз ёю кіруе кандыдат педагагічных навук, дацэнт Н. В. Літвіна.

За гэты час на кафедры даследаваліся самыя разнастайныя праблемы дашкольнай педагогікі: патрыятычнае выхаванне дзяцей дашкольнага ўзросту; індывідуальны падыход у працоўным выхаванні дашкольнікаў; пытанні экалагічнага, сямейнага выхавання, выхавання маральнага абавязку і г. д. Супрацоўнікі сталі аўтарамі шматлікіх метадычных

дапаможнікаў і метадычных рэкамендацый. У вучэбным працэсе ВНУ, школы, дашкольнай установы шырока выкарыстоўваюцца вучэбныя дапаможнікі, падрыхтаваныя выкладчыкамі кафедры. Калектыў вызначаецца свабодай творчасці, уменнем заўважыць і падтрымаць цікавы пачын, навуковы пошук, зацікаўленасцю ў навуковым і прафесійным росце.

Навукова-даследчая работа студэнтаў і аспірантаў вядзецца ў рамках праблем, якія вывучаюцца выкладчыкамі кафедры. У даследаваннях па тэме "Фарміраванне педагагічнай культуры студэнтаў факультэта дашкольнага выхавання ва ўмовах універсітэцкай падрыхтоўкі" (навуковы кіраўнік — дацэнт В. І. Мітраш) актыўна вядзецца пошук эфектыўных шляхоў, сродкаў, форм і метадаў прафесійнай падрыхтоўкі будучых педагогаў дашкольных устаноў. У апошнія гады вызначыліся новыя накірункі — "Шляхі гуманізацыі выхавання і навучання дашкольнікаў у дзіцячым садзе і сям'і" (навуковы кіраўнік — дацэнт Н. В. Літвіна) і "Спадчына вядомых педагогаў XX ст. і іх уплыў на развіццё сучаснага выхавання" (навуковы кіраўнік — дацэнт Л. І. Суарэс).

**Кафедра агульнай і дзіцячай псіхалогіі** створана ў 1978 годзе. Узначаліў яе Я. Л. Каламінскі, які за гады работы тут стаў доктарам псіхалагічных навук, прафесарам, акадэмікам Акадэміі адукацыі Рэспублікі Беларусь, акадэмікам Балтыйскай педагагічнай акадэміі і шэрага іншых міжнародных акадэмій, заслужаным дзеячам навукі Рэспублікі Беларусь. Каля 40 год ён працуе ў галіне сацыяльнай псіхалогіі і псіхалогіі асобы. Вынікі шматгадовых даследаванняў адлюстраваны ў больш чым 400 навуковых работах. Многія з іх выдадзены за мяжой, больш за 30 навуковых работ Я. Л. Каламінскага апублікаваны на 15 мовах.

Яго тэарэтычныя і практычныя даследаванні паклалі пачатак стварэнню навуковай школы ўзроставай і педагагічнай сацыяльнай псіхалогіі. Ля вытокаў кафедры была Л. А. Панько — кандыдат псіхалагічных навук, прафесар, аўтар больш за 260 работ. Намаганнямі прафесара Л. А. Панько і яе паслядоўнікаў укараняецца ў жыццё новая канцэпцыя развіцця дашкольнай адукацыі, гуманістычна арыентаваныя праграмы "Вытокі", "Пралеска", "Радуга" і іншыя, якія прадугледжваюць псіхалагізацыю ўсяго выхаваўча-адукацыйнага працэсу ў адукацыйнай установе.

Даследаванні старшага выкладчыка Л. А. Мельнічук па праблемах сямейнага выхавання дзяцей адлюстраваны ў шматлікіх артыкулах, тэзісах канферэнцый, навуковых семінараў. За апошнія 10 год на кафедры пад кіраўніцтвам дацэнта А. Н. Белавус выканана серыя даследаванняў па праблеме развіцця памяці дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту. За кафедрай замацаваны шэраг дысцыплін, у ліку якіх агульная псіхалогія, сацыяльная псіхалогія, гісторыя псіхалогіі, а таксама спецыяльныя — псіхалогія развіцця, псіхалагічныя асновы прафарыентацыі і інш.

Кафедра агульнай і дзіцячай псіхалогіі — гэта высокапрафесійны калектыў кампетэнтных выкладчыкаў і вучоных. Вучэбны працэс ажыццяўляюць тры прафесары — Я. Л. Каламінскі, Л. А. Кандыбовіч, Л. А. Панько, дацэнты А. М. Счасная, А. Н. Белавус, Е. І. Камкова, Е. Л. Гуткоўская і інш.

За апошнія 5 год апублікавана 240 работ выкладчыкаў кафедры, распрацаваны і апублікаваны шэраг вучэбных дапаможнікаў. У сучасны момант кафедра працуе над праблемай распрацоўкі метадалагічных падыходаў і сродкаў фарміравання агульнай і прафесійнай псіхалагічнай культуры на асноўных этапах антагенезу.

У 1986 годзе створана **кафедра методык дашкольнага выхавання**, якую ўзначаліла дацэнт Л. Б. Гаруновіч. Навуковы патэнцыял кафедры рос вельмі хутка. Ужо праз кароткі час многія супрацоўнікі атрымалі вучоную ступень кандыдата навук. Тут абараніла доктарскую дысертацыю, атрымала званне прафесара і ў 1998 годзе ўзначаліла кафедру Н. С. Старжынская. З 2001 года кафедрай кіруе І. В. Жытко.

Калектыў кафедры накіроўвае сваю дзейнасць на распрацоўку новых, нетрадыцыйных метадаў работы са студэнтамі, удзельнічае ў распрацоўцы тыпавых праграм вучэбных дысцыплін, Дзяржаўнага стандарта спецыяльнасці, першай дзяржаўнай нацыянальнай базіснай праграмы "Пралеска". Распрацаваны аўтарскія праграмы выхавання і навучання дашкольнікаў "Гармонія" (В. А. Сілівон), "Фізкульт-Ура!" (В. Н. Шыбека). Пад навуковай рэдакцыяй І. В. Жытко распрацаваны і выдадзены дзяржаўныя праграмы "Выхаванне і навучанне дзяцей 7-га года жыцця ў старшай групе (другі год навучання) у дашкольнай установе". Аўтарытэт і навуковая значнасць укладу выкладчыкаў кафедры ў распрацоўку праблем дашкольнага выхавання Рэспублікі Беларусь праявіліся ў тым, што яны прынялі ўдзел у распрацоўцы такіх дзяржаўных дакументаў, як "Канцэпцыя дашкольнай адукацыі Рэспублікі Беларусь", Дзяржаўны стандарт "Дашкольная адукацыя. Спецыяльная гатоўнасць". Удасканаленню вучэбнай работы падпарадкаваны і працэс стварэння і ўкаранення ў практыку новых падручнікаў, вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў для студэнтаў педагагічных ВНУ і навучэнцаў педагагічных каледжаў.

Разнастайнасць талентаў членаў кафедры рэалізуецца праз развіццё здольнасцей студэнтаў. Выкладчык Е. Е. Калошкіна з 1996 года кіруе студэнцкім гуртком "Габеленчык", Л. А. Бакарыкава — гуртком па вырабу кветак з тканіны "Рамонак", шмат год кіруе танцавальным ансамблем "Прыгажуні" Г. П. Ганчарэнка.

Факультэт супрацоўнічае больш чым з 60 адукацыйнымі ўстановамі Мінска і Мінскай вобласці: педкаледжамі, школамі, дашкольнымі ўстановамі, раённымі аддзеламі адукацыі. Выкладчыкі вядуць у супрацоўніцтве з імі



**На здымку:** загадчык кафедры агульнай і дзіцячай псіхалогіі, доктар псіхалагічных навук, прафесар Я. Л. Каламінскі гутарыць з выкладчыкамі кафедры.

вялікую даследчую і кансультатыўную работу. Спалучэнне агульнатэарэтычных і практычных накірункаў навуковых даследаванняў, багаты вопыт падрыхтоўкі будучых спецыялістаў сістэмы адукацыі дазволіў выкладчыкам арганізаваць трывалую сувязь з установамі павышэння кваліфікацыі. Факультэт дашкольнага выхавання стаў буйным навукова-метадычным цэнтрам, які аказвае істотны ўплыў на змест і метады падрыхтоўкі спецыялістаў дашкольнай адукацыі. Ён з'яўляецца ініцыятарам і арганізатарам правядзення міжнародных, рэспубліканскіх навукова-практычных канферэнцый, "круглых сталоў", семінараў, на якіх абмяркоўваюцца праблемы ўдасканалення выкладання, пераемнасці ў навучанні і выхаванні дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту.

На нашу думку, варта адмовіцца ад разумення пераемнасці як фармальных, знешніх сувязей паміж дзіцячымі садамі і пачатковымі школамі, а таксама ад спроб капіраваць у дзіцячых садах работу школьнага настаўніка. Вельмі важна наладзіць плённае супрацоўніцтва выхавальніка, настаўніка, бацькоў.

Работа па інтэграцыі дзейнасці школ і дашкольных устаноў можа быць канструктыўнай і эфектыўнай толькі пры ўмове істотнага абнаўлення зместу адукацыі па прынцыпах гуманізацыі і дэмакратызацыі адукацыйнага працэсу ў гэтых звёнах адукацыйнай сістэмы. Неабходна распрацоўка і ўкараненне ў практыку інавацыйных, пераемных па сваёй сутнасці праграм, а таксама дыферэнцыя навучання і выхавання з улікам узроставых, псіхалагічных індывідуальных асаблівасцей кожнага дзіцяці, перабудова сістэмы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі педагагічных кадраў з арыентацыяй на новыя профілі адукацыйных устаноў і магчымасць аказання імі дадатковых паслуг насельніцтву. Аснову гэтай работы павінна складаць разуменне агульнай стратэгічнай для ўсіх звёнаў адукацыі ідэі, ідэі забеспячэння высокага ўзроўню развіцця асобы. Кожнае звяно рэалізуе гэту ідэю ў спецыфічных прыярытэтных накірунках работы: пачатковая школа заклікана фарміраваць у дзяцей уменне вучыцца, стварыць умовы, пры якіх навучанне становіцца для дзіцяці радасцю, асноўнай формай самавыяўлення; дашкольная ўстанова забяспечвае ранняе развіццё комплексу асобасных якасцей, якія забяспечваюць лёгкі, натуральны пераход дзіцяці з сада ў школу.

Такім чынам ажыццяўляецца творчае супрацоўніцтва ў дасягненні агульнай мэты — усямернага развіцця асобы дзіцяці.

У навукова-даследчую работу актыўна ўключаюцца студэнты, яны штогод удзельнічаюць у разнастайных рэспубліканскіх конкурсах, неаднаразова нашы юнакі і дзяўчаты становяцца пераможцамі.

Сёння мы засяроджваем увагу на распрацоўцы і ўкараненні ў практыку канцэпцыі універсітэцкай адукацыі спецыялістаў дашкольнай адукацыі, на абнаўленні зместу адукацыі ў сувязі з пераходам на новыя адукацыйныя праграмы, рэалізацыі дзяржаўных адукацыйных стандартаў.

# Час, імёны, тэмы

## *Падрыхтоўка нацыянальных навукова-педагагічных кадраў у галіне пачатковай адукацыі ў 60 — 80-я гады XX стагоддзя*

**■ Адкрыццё ў 1934 годзе аспірантуры пры Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя А. М. Горкага садзейнічала развіццю навукова-даследчай дзейнасці ў вышэйшых навучальных установах, павышэнню эфектыўнасці падрыхтоўкі вучоных-педагогаў у галіне пачатковай адукацыі.**

У перыяд з 1968 па 1990 год XX стагоддзя па пытаннях пачатковага навучання было абаронена 15 кандыдацкіх дысертацый.

Безумоўна, каштоўнасць гэтых напрацовак і ў наш час з'яўляецца відавочнай. Таму варта яшчэ раз нагадаць змест даследаванняў і даць кароткую характарыстыку абароненых дысертацый.

*Як усё пачыналася...*

**А. І. Самарцаў** у сваёй працы "Выхаванне эстэтычнага ўспрымання прыроды ў дзяцей малодшага школьнага ўзросту" (1968), зыходзячы з таго, што найважнейшым сродкам эстэтычнага выхавання з'яўляецца прырода, абгрунтаваў неабходнасць і важнасць ажыццяўлення гэтага выхавання, пачынаючы з ранняга школьнага ўзросту (І — ІІІ класы). Актуальнасць даследавання вынікала з таго, што гэта была першая спроба абгрунтавання неабходнасці выхавання эстэтычнага ўспрымання прыроды ў малодшых школьнікаў.

Мэтай даследавання з'явілася тэарэтычнае і метадычнае абгрунтаванне магчымасцей і шляхоў выхавання ў малодшых школьнікаў эстэтычнага ўспрымання прыроды і вызначэнне яго значнасці для ўсебаковага развіцця асобы дзіцяці. Аўтар выкарыстоўвае прынцып пераемнасці ў навучанні паміж дашкольным перыядам і школай.

Зыходным пунктам даследавання з'яўляецца палажэнне аб тым, што ў дзяцей (асабліва вясковых) вельмі рана развіваюцца утылітарныя адносіны да прыроды, якія часта пераносяцца і на ўспрыманне яе мастацкага адлюстравання. У рабоце акрэслены шляхі гарманізацыі практычных і эстэтычных адносін да прыроды, развіцця ў дзяцей здольнасці бачыць і эстэтычна ўспрымаць хараство жывёльнага і расліннага свету.

*У 70-я гады дысертацыйныя даследаванні маюць інтэграваны характар: педагагічны эксперымент грунтуецца на веданні псіхафізічных асаблівасцей малодшых школьнікаў.*

У даследаванні **М. А. Бярозавіна** "Уплыў настаўніка на міжасобасныя адносіны вучняў у пачатковых класах" ( 1971) быў выяўлены ўплыў на вучняў